Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 2. С. 103–107

УДК 94(476):502.1

# ПАДРЫХТОЎКА І РЭАЛІЗАЦЫЯ «ПОЛОЖЕНИЯ О СБЕРЕЖЕНИИ ЛЕСОВ» 1888 г. НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ

**І. В. Пугач,**
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

UDC 94(476):502.1

# PREPARATION AND REALIZATION OF THE “STATUTE ON PROTECTION OF FORESTS” OF 1888 IN THE TERRITORY OF BELARUSIAN PROVINCES

**I. Pugach,**
*Postgraduate Student of the Department of the History of Belarus and Slavic Nations, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Паступіў у рэдакцыю 23.03.20

Received on 23.03.20

Артыкул прысвечаны пытанню распрацоўкі і рэалізацыі «Положения о сбережении лесов» 1888 г. на тэрыторыі беларускіх губерняў. Асаблівая ўвага надаецца дзейнасці дзяржаўных органаў кіравання па вывучэнні адпаведнага замежнага заканадаўства, падрыхтоўцы праектаў «Положения…» і яго рэалізацыі з улікам мясцовых асаблівасцей на тэрыторыі Беларусі. На падставе атрыманых вынікаў робіцца выснова аб паспяховасці захадаў урада ў адзначаным кірунку.

*Ключавыя словы:* беларускія губерні, ахова лясоў, дзяржаўная лесаахоўная адміністрацыя, «Положение о сбережении лесов», лесаахоўныя камітэты.

The article is devoted to the question of working out and realization of the “Statute on protection of forests” of 1888 in the territory of Belarusian provinces. Special attention is given to the activity of state administration bodies on studying the corresponding foreign laws, preparation of projects of the “Statute...” and its realization with the account of local features in the territory of Belarus. On the base of the obtained results the conclusion about successful work of the administration in the mentioned direction is made.

*Keywords:* Belarusian provinces, protection of forests, state forest-protecting administration, “Statute on protection of forests”, forest-protecting committees.

*Уводзіны.* У парэформенны перыяд Расійская імперыя актыўна асвойвала лясныя рэсурсы. Прадукцыя, атрыманая ў выніку вядзення лесагаспадарчай дзейнасці, выкарыстоўвалася ў якасці паліва, будаўнічых матэрыялаў, забяспечвала патрэбы арміі, флоту і насельніцтва, а таксама накіроўвалася на экспарт. Распрацоўка лясоў займала важнае месца ў прыватнаўласніцкай гаспадарчай дзейнасці. Асабліва значэнне лясных рэсурсаў узрасло ў канцы XIX – пачатку XX ст. На тэрыторыі Беларусі гэта было звязана з развіццём інфраструктуры (будаўніцтва чыгуначных шляхоў зносін), стварэннем шэрагу заводаў па перапрацоўцы драўніны і г. д. Трэба адзначыць, што доўгая фактычная адсутнасць кантролю з боку дзяржавы за прыватным лесаўладаннем прывяла да знясілення вялікай колькасці прыватнаўласніцкіх лясоў, бо, як сведчыла лясная адміністрацыя, лесаўласнікі «…ведут свое хозяйство таким образом, чтобы быстрее реализовать лес, сдают под вырубку большие площади, не производят искусственного возобновления, рубят так, что и естественно [лес] не возобновляется…» [1, арк. 3–3 адв.]. У такіх умовах асабліва важным падавалася далейшае развіццё сістэмы аховы і зберажэння лясоў і распаўсюджванне яе дзейнасці на ўсе лясы, незалежна ад іх маёмаснага статусу. Трэба адзначыць, што ўрад прымаў некаторыя захады для паляпшэння сітуацыі, якія, аднак, нельга лічыць комплексным вырашэннем праблемы [1, арк. 208б–210]. Па большай частцы, іх змест быў накіраваны на папярэджванне парушэнняў ляснога заканадаўства і амаль не рэгламентаваў рацыянальнае лесакарыстанне. Аднак дадзеная праблема не стала прадметам спецыяльнага даследвання ў айчыннай гістарыяграфіі.

*Асноўная частка.* Згодна з указам ад 22 снежня 1864 г. былі складзены меркаванні аб захадах, якім маглі б быць падпарадкаваны прыватныя лясы дзеля аховы іх ад далейшага вынішчэння [1, арк. 210]. Міністэрства ўнутраных спраў разаслала іх на абмеркаванне земскіх і дваранскіх сходаў. У водгуках з месцаў адзначалася неабходнасць узмацніць сродкі аховы прыватнаўласніцкіх лясоў ад усялякага роду праваапарушэнняў і асабліва падкрэслівалася немагчымасць абмежавання лесаўласнікаў у сваіх правах. У выніку далейшае рашэнне праблемы фактычна прыпынілася да 1875 г., калі міністр дзяржаўных маёмасцей П. А. Валуеў падняў пытанне перад Камітэтам міністраў аб прыняцці захадаў супраць вынішчэння прыватнаўласніцкіх лясоў. Ён прадставіў уласна складзены праект палажэння аб зберажэнні лясоў. Камітэт міністраў прызнаў неадкладнасць справы, аднак адзначыў, што «…введение в действие каких-либо ограничений частного лесовладения неминуемо повлечет за собой многие практические затруднения и возбудит целый ряд вопросов и недоразумений…» [1, арк. 210].

Каб пазбегнуць магчымых цяжкасцей, 2 студзеня 1876 г. пры Міністэрстве дзяржаўных маёмасцей была заснавана спецыяльная камісія з прадстаўнікоў ведамства, а таксама Міністэрства фінансаў, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства юстыцыі, Міністэрства шляхоў зносін і былога II аддзялення ўласнай канцылярыі імператара. У тым жа годзе на пасяджэнне камісіі былі запрошаны 42 эксперты названых устаноў. Вынікам іх работы стаў праект палажэння аб зберажэнні лясоў. Трэба адзначыць, што міністр Валуеў скарыстаў толькі некаторыя вынікі работы камісіі. 25 лютага 1877 г. ён прадставіў свой праект да

разгляду ў Дзяржаўны савет [1, арк. 210 адв.]. Істотнае адрозненне паміж праектамі камісіі і П. А. Валуева заключалася ў наступным. Па праекце камісіі захады па зберажэнні павінны былі распаўсюджвацца толькі на тыя лясы, якія прызнаваліся ахоўнымі паводле мясцовага абследавання кожнай лясной дачы паасобку. Праект міністра прадугледжваў іх распаўсюджванне без папярэдняга абследавання на ўсе дачы, плошча якіх перавышала норму, вызначаную для губерні. Дачы, плошча якіх была менш нормы, заставаліся свабоднымі ад абмежаванняў, за выключэннем тых, якія былі неабходны для замацавання сыпучых пяскоў і папярэджвання абмялення рэк. Акрамя таго, у праекце камісіі рэгулявалася пытанне кампенсацыі лесаўласнікам за рознага роду абмежаванні, якое ігнаравалася Валуевым. У сувязі з велізарнай спецыфікай М. Н. Астроўскім (міністр дзяржаўных маёмасцей з 1881 па 1892 г.) было прынята рашэнне абмежавацца распрацоўкай асноўных правіл, а пасля іх зацвярджэння прыступіць да распрацоўкі поўнага палажэння. Па гэтых меркаваннях і даручэнні міністра камітэтам, які пры ім састаяў, быў падрыхтаваны праект аб зберажэнні лясоў і летам 1882 г. прадстаўлены да разгляду. Аднак сам міністр яго адхіліў, спасылаючыся на тое, што практычнае значэнне закону вызначаецца не столькі палажэннямі, з якіх ён зыходзіць, колькі тымі прыватнымі правіламі, якімі асноўныя яго палажэнні прымяняюцца да ўмоў і патрабаванняў грамадскага жыцця. Каб не паставіць усё пытанне на чыста тэарэтычную глебу, пачалася распрацоўка некаторых прыватных палажэнняў, без усведамлення якіх было б немагчыма вызначыць тое значэнне, якое будзе мець меркаваны закон у гаспадарцы краіны і ў агульным строі юрыдычных адносін [1, арк. 211–212 адв.].

Пастановы, якія вызначаліся праектам палажэння аб зберажэнні лясоў, падзяляліся на тыя, што абмяжоўвалі лесаўласнікаў у праве іх распараджэння лясамі, і захады заахвочвання правільнага лесакарыстання. Абмежаванням падвяргаліся лясы, якія папярэджвалі абвалы, эрозію, замацоўвалі сыпучыя пяскі і г. д., а таксама тыя, што патрабавалі аховы, зыходзячы з іх месцазнаходжання (вярхоўі рэк і іх прыток, малалесныя мясцовасці і інш.). Уласнікаў астатніх лясоў не планавалася падвяргаць ніякім абмежаванням. У праекце была прадпрынята спроба вызначыць механізм вылучэння лясоў у адзначаныя катэгорыі, парадак ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці ў іх, ільготы, якія атрымлівалі лесаўласнікі ў выніку выканання пастаноў палажэння, адказнасць за парушэнне апошніх, а таксама органы дзяржаўнага кіравання, якія павінны былі ажыццяўляць нагляд за прывядзеннем палажэння ў выкананне [1, арк. 174–181 об.].

Адным з найбольш важных крокаў урада ў справе распрацоўкі лесаахоўнага заканадаўства стала вывучэнне адпаведнай практыкі ў шэрагу краін Еўропы. Прадметам разгляду сталі адпаведныя законы Аўстрыі, Баварыі (законы прыняты ў 1852 г.), Бадэна (1854 г.), Браўншвейга (1861 г.), Вюртэмберга, Венгрыі (1879 г.), Прусіі (1875 г.), Францыі (1827 г.), Італіі (1877 г.) і Швейцарыі (1876 г.) [2, арк. 1, 3, 5, 6–6 адв., 8, 10, 12, 16 адв., 18]. Так, было высветлена, што ў Аўстрыі, Баварыі, Вюртэмбергу, Бадэне і Браўншвейгу нагляду з боку ўрада падлягалі ўсе прыватныя лясы. У Прусіі да асабліва ахоўных лясоў адносіліся тыя, якія замацоўвалі сыпучыя пяскі, папярэджвалі абвалы, ветравую эрозію, паніжэнне ўзроўню рэк і да т. п. У іншых дзяржавах крытэрыі, па якіх лясы траплялі ў ахоўную катэгорыю, былі падобнымі, але мелі сваю спецыфіку. Так, у Венгрыі ўрадавы нагляд распаўсюджваўся і на лясы, вынішчэнне якіх магло б пагражаць бяспецы дарог, у Францыі – на лясы, якія служылі для аховы дзяржаўных межаў і грамадскага здароўя, у Швейцарыі – на лясы ў малалесных мясцовасцях, якія засцерагалі ад негатыўных кліматычных з’яў, у Італіі – на лясы, якія знаходзіліся на пласкагор’ях і схілах гор, а таксама на абязлесеныя там жа плошчы і землі, якія па якасці глебы і месцазнаходжанні, не знаходзячыся пад лесам, маглі б падвергнуцца абвалам і размывам, справакаваць забруджванне рэк і ўгоддзяў ці пашкодзіць санітарна-гігіенічным умовам мясцовасці [2, арк. 21 адв., 22, 23].

Рэалізацыя аховы адзначаных лясоў у розных дзяржавах ускладалася на розныя органы. Так, у Бадэне, Баварыі і Вюртэмбергу адпаведныя функцыі выконвала выключна лясная адміністрацыя, у Аўстрыі і Францыі – органы МУС, у Італіі і Венгрыі – спецыяльныя камітэты, у Прусіі – лесаахоўны суд (ролю суда адыгрывалі органы мясцовага кіравання, падведамасныя МУС), у Швейцарыі – урад кантонаў [2, арк. 30–30 адв.].

Агульная мэта нагляду за ахоўнымі лясамі заключалася ў тым, каб іх плошча не памяншалася і па магчымасці павялічвалася. Дасягненне гэтай мэты бачылася ў забароне ператварэння лясной плошчы ў іншую разнавіднасць угоддзяў, спусташальных высечак, распрацоўцы падрабязных лесагаспадарчых планаў, прыняцці захадаў супраць шкодных насякомых і аблясенні бязлесных тэрыторый. Трэба адзначыць, што не ва ўсіх дзяржавах, зыходзячы з мясцовых умоў, адзначаныя захады прымаліся ў поўным аб’ёме. Напрыклад, у Францыі патрабаванні да прыватных лясоў былі найбольш ліберальнымі. Заканадаўства патрабавала не праводзіць у ахоўных лясах расчыстак без дазволу адміністрацыі. Адносна астатніх лясоў дзяржава атрымала права экспрапрыяцыі ў тых выпадках, калі патрабавалася правядзенне работы для ўзнаўлення глебавага покрыва. Пры рэалізацыі адзначаных захадаў лесаўласнікі атрымлівалі кампенсацыю. Пры гэтым аўстрыйскі вопыт па арганізацыі нагляду за ахоўнымі лясамі характарызаваўся расійскімі спецыялістамі так: «…Всего полнее и абсолютнее по своему значению для частных лесов законодательство австрийское, где к лесам, требующим особенно сильной охраны, причисляются даже леса, угрожающие частному имуществу. Далее идти в мерах к сбережению частных лесов едва ли возможно…» [2, арк. 23 адв.–29].

Палажэнне, якое праектавалася расійскім урадам, «…занимает среднее место между иностранными законодательствами, не достигая абсолютного характера австрийского закона…». Пры вылучэнні лясоў у катэгорыю ахоўных першапачаткова ў разлік браліся толькі найбольш важныя з іх. Пры гэтым не ўзгадваліся такія акалічнасці, як кліматычныя і санітарна-гігіенічныя ўмовы, прадукцыйнасць зямлі, ветравая эрозія, абмяленне рэк і г. д. Патрабаванні да вядзення гаспадарчай дзейнасці ў гэтых лясах прадугледжвалі рэгуляванне расчыстак і забарону спусташальных высечак. Абавязковае лесаразвядзенне на бязлесных плошчах не ўводзілася, так як урад не хацеў патраба-

ваць ад лесаўласнікаў ніякіх работ, якія б былі звязаны з выдаткамі [2, арк. 29–29 адв.]. Агульнае вядзенне спраў па наглядзе за ахоўнымі лясамі ўскладалася на міністра дзяржаўных маёмасцей, але з тым, каб ён дзейнічаў сумесна з міністрам унутраных спраў і іншымі міністрамі. Важнейшыя рашэнні павінны былі абмяркоўвацца Камітэтам міністраў. У губернях адпаведныя функцыі планавалася ўскласці на спецыяльныя лесаахоўныя камітэты, у якіх павінны былі ў дастатковай ступені быць прадстаўлены інтарэсы дзяржаўнай улады і мясцовых лесаўласнікаў [2, арк. 31].

Да канца 80-х гг. XIX ст. праект дапрацоўваўся з улікам дасягненняў лесазнаўства, а таксама ўласнага і замежнага вопыту. У выніку 4 красавіка 1888 г. было выдадзена «Положение о сбережении лесов» [3]. Яно складалася з некалькіх раздзелаў. Ва ўводзінах былі адзначаны агульныя ўмовы дзеяння «Положения…». Трэба адзначыць, што яно распаўсюджвалася на лясы ўсёй Еўрапейскай Расіі незалежна ад іх маёмаснай прыналежнасці і толькі часова былі прадугледжаны пэўныя абмежаванні. Так, правілы першапачаткова не распаўсюджваліся на лясы, правы на якія былі зафіксаваны ў «владенных записях» і ва ўстаўных граматах. Гэтыя правілы не тычыліся і лясоў, якія перадаваліся казной ва ўласнасць ці арэнднае карыстанне розным установам і таварыствам і інш. На лясы, якія ахоўвалі вярхоўі рэк ці іх прытокі, было прынята рашэнне распаўсюдзіць дзеянне «Положения…» без выключэнняў.

Усе захады па ахове лясоў падзяляліся на дзве групы: тыя, што ахоўвалі лясы ад вынішчэння і знясілення, і тыя, што заахвочвалі вядзенне ў лясных дачах рацыянальнай лясной гаспадаркі. Для распаўсюджвання заканадаўства на ахоўныя лясы трэба было, каб іх ахоўнае значэнне спачатку было пацверджана. Пасля гэтага ў лесе забараняліся ўсялякія высечкі. Карыстацца можна было ламаччам і сухастойным лесам. Да ахоўных лясоў адносіліся лясы і хмызнякі, якія стрымлівалі сыпучыя пяскі, абаранялі ад пясчаных заносаў гарады, сёлы, чыгункі, шашэйныя і паштовыя дарогі, ахоўвалі берагі судаходных рэк, каналаў і водных крыніц ад абрываў і г. д. Трэба адзначыць, што ў змесце «Положения…» прадугледжваліся пакаранні за парушэнне яго пунктаў. Так, не дапушчалася высечка лясоў у ахоўных дачах перад зацвярджэннем для іх гаспадарчых планаў, а таксама высечка лясоў у неахоўных дачах звыш устаноўленай нормы, зацверджанай у лесаахоўным камітэце. Забараняліся і спусташальныя высечкі і недазволенае выкарчоўванне пнёў. Незаконна здабыты лес падвяргаўся канфіскацыі, а вінаватыя выплочвалі штраф, эквівалентны каштоўнасці гэтага лесу. За расчыстку ці пераўтварэнне лясоў у іншы від угоддзяў у ахоўных лясах злачынцы павінны былі выплаціць грашовае спагнанне ў памеры пяці руб. за кожныя 100 сажаней расчышчанай плошчы. Акрамя таго, былі прадугледжаны штрафы за недазволены выпас жывёлы ў лесе і самавольны збор ляснога надглебавага покрыва. Грошы, атрыманыя ў выніку выплат спагнанняў і продажу канфіскаванага лесу, складалі спецыяльныя сродкі ляснога ведамства. Яны маглі выкарыстоўвацца на патрэбы лясной гаспадаркі, а менавіта складанне планаў гаспадаркі ў ахоўных лясах, выкананне ў гэтых лясах лесагаспадарчых мерапрыемстваў, стварэнне спецыяльных пунктаў для водпуску ўласнікам саджанцаў і насення і на грашовыя ўзнагароды для лясной варты. Да таго ж была апісана працэдура распачынання крымінальных спраў [3].

Рэалізацыя «Положения о сбережении лесов» ускладалася на губернскія лесаахоўныя камітэты, падначаленыя Міністэрству дзяржаўных маёмасцей. Віленскі, Віцебскі, Гродзенскі, Магілёўскі і Мінскі губернскія лесаахоўныя камітэты пачалі сваю дзейнасць восенню 1888 г. [4, арк. 69–71 адв., 78–78 адв., 82, 84]. Першапачаткова дзеянне «Положения о сбережении лесов» не распаўсюджвалася на прыватнаўласніцкія лясы Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. У поўным аб'ёме ў беларускіх губернях яно ўступіла ў дзеянне ў 1892 г. [5; 6, арк. 2, 7–8 адв.]. Пад старшынствам губернатара ў склад лесаахоўнага камітэта ўваходзілі віцэ-губернатар (з 26 снежня 1888 г.), губернскі прадвадзіцель дваранства, старшыня акруговага суда, лясныя рэвізоры, старшыня губернскай земскай управы або яе член, абавязкова член губернскай прысутнасці або губернскай па сялянскіх справах прысутнасці і два члены з мясцовых лесаўласнікаў, якія выбіраліся губернскім земскім сходам. Да правядзення на тэрыторыі беларускіх губерняў земскай рэформы старшыня губернскай земскай управы замяняўся яшчэ адным членам ад лесаўласнікаў. Апошнія запрашаліся міністрам унутраных спраў па прадстаўленні губернатара, якое было заснавана на згодзе губернскага прадвадзіцеля дваранства. Справаводства ўскладалася на мясцовых кіраўнікоў дзяржаўнымі маёмасцямі, іх памочнікаў ці лясных рэвізораў, а непасрэдны нагляд за лясамі здзяйснялі мясцовыя лясныя чыноўнікі. Па некаторых справах у камітэт запрашаўся прадстаўнік ведамства шляхоў зносін. На некаторых лясных рэвізораў ускладаліся абавязкі рэвізораў-інструктараў [3; 7, арк. 1–1 адв.; 8]. Трэба адзначыць, што значны і разнастайны склад і функцыянальная скіраванасць камітэтаў рабілі іх адносна самастойнымі і незалежнымі ад упраўленняў дзяржаўных маёмасцей калегіяльнымі ўстановамі. Пастановы камітэта прызнаваліся сапраўднымі толькі тады, калі ў пасяджэнні, акрамя старшыні альбо асобы, якая яго замяняла, удзельнічалі губернскі прадвадзіцель дваранства, старшыня акруговага суда і старшыня губернскай земскай управы ці асоба, якая яго замяшчала [3]. Такое ўладкаванне лесаахоўных камітэтаў спрыяла адстойванню інтарэсаў казны (шляхам арганізацыі рацыянальнай лясной гаспадаркі ў лясах розных маёмасных статусаў) пры захаванні інтарэсаў лесаўласнікаў.

Лесаахоўныя камітэты павінны былі выконваць наступныя функцыі: аднясенне лясоў да катэгорыі ахоўных і выданне дазволаў на пераўтварэнне лясных плошчаў у іншы від угоддзяў; спыненне распараджэнняў лесаўласнікаў аб правядзенні спусташальных высечак; устанаўленне тэрмінаў для штучнага аблясення ўласнікамі незаконна высечаных ці расчышчаных плошчаў; правядзенне агульнага нагляду за адпаведнымі лясамі; прыцягненне да адказнасці вінаватых у парушэнні правілаў «Положения о сбережении лесов». Трэба адзначыць, што прызнанню лясоў ахоўнымі ці падлеглымі зберажэнню, пастанаўленням аб спыненні спусташальных высечак павінна было папярэднічаць вывучэнне лясными чыноўнікамі ўсіх абставін, якія адносіліся да справы. Аб правядзенні гэ-

тых мерапрыемстваў лесаўласнікі ці загадчыкі лясоў павінны былі папярэджвацца не пазней як за 7 дзён. Пастановы аб наданні лясам статусу ахоўных альбо падлеглых зберажэнню, зацвярджэнні гаспадарчых планаў, спыненні спусташальных высечак набывалі для лесаўласнікаў абавязковы характар са дня іх абвяшчэння. Да распарадчых функцый лесаахоўных камітэтаў адносіліся: размеркаванне лясоў, для нагляду паміж чынамі казённага лясного ведамства, паліцыі і павятовых па сялянскіх справах устаноў; перадача ім паўнамоцтваў на распачынанне праследаванняў; разгляд скаргаў на прысуды па справах аб парушэннях «Положения…»; падрабязнае тлумачэнне кантралюючым асобам іх абавязкаў і способу іх выканання, а таксама парадку справаздачнасці. Трэба адзначыць, што лесаахоўныя камітэты не дзейнічалі бескантрольна. У выпадку нязгоды з пастановамі камітэтаў прыватныя асобы, таварыствы і іншыя ўстановы маглі накіроўваць скаргі міністру дзяржаўных маёмасцей у двухмесячны тэрмін з моманту іх абвяшчэння. Першапачаткова скаргі падаваліся ў адпаведны лесаахоўны камітэт, які на працягу двух тыдняў павінен быў прадставіць іх міністру са сваімі тлумачэннямі [3]. З мэтай пазбягання памылковага выканання «Положения…» міністэрства распрацавала спецыяльныя дапаможныя матэрыялы. Так, напрыклад, 18 ліпеня 1888 г. у Мінскае ўпраўленне дзяржаўных маёмасцей было накіравана 40 экзэмпляраў «Сборника законоположений о сбережении и охранении частных и общественных лесов, с приложениями данных Министерства государственных имуществ, инструкцией и наставлениями о порядке приведения в исполнение Положения о сбережении лесов» [7, арк. 5], а 31 сакавіка 1889 г. – 20 экзэмпляраў «Инструкции для устройства защитных лесов» [7, арк. 16].

Вынікі рэалізацыі «Положения…» 1888 г. на тэрыторыі беларускіх губерняў паказваюць наступныя статыстычныя даныя. Перш за ўсё трэба адзначыць, што колькасць лясоў, якія падлягалі кантролю з боку лесаахоўных камітэтаў, паступова павялічвалася. Так, калі ў 1901 г. такіх лясоў у краі было звыш 5,5 млн дзес., то ў 1907 г. – каля 7 млн дзес., з якіх звыш 70 % складалі прыватнаўласніцкія і менш 1 % атрымалі статус ахоўных. Для параўнання, за мясцовымі ўпраўленнямі дзяржаўных маёмасцей у гэты перыяд было замацавана каля 1,3 млн дзес. лясоў. З 1901 па 1907 г. у лесаахоўных камітэтах былі зацверджаны планы на вядзенне лесагаспадарчай дзейнасці звыш чым на 4,5 тыс. дзес. ахоўных лясоў і 1,3 млн дзес. іншых лясоў, а таксама нанесены на карты звыш 195 тыс. дзес. лясных плошчаў. Акрамя таго, на лесаўласнікаў былі ўскладзены абавязкі па штучным аблясенні звыш 1,7 тыс. дзес. [9, с. 2–7, 226–229; 10, с. 40–45, 266–269; 11, с. 2–7, 246–251; 12, с. 2–7, 318–323; 13, с. 2–7, 322–361, 434–439; 14, с. 2–7, 318–353, 416–421; 15, с. 2–7, 344–379, 442–447]. Адзначанае можа сведчыць пра дастаткова істотную работу, праведзеную лесаахоўнымі камітэтамі па рэгуляванні лесагаспадарчай дзейнасці ў краі пры адначасовым пазбяганні значнага ўціску лесаўласнікаў. Пры гэтым варта звярнуць увагу на тое, што распаўсюджванне лесаахоўнай дзейнасці дзяржаўных органаў кіравання на значна большую колькасць лясоў цягнула за сабой істотнае павелічэнне нагрузкі на мясцовых лясных чыноўнікаў. Гэта выявілася ў першыя гады дзейнасці лесаахоўных камітэтаў у краі. Так, лесаахоўны камітэт Віленскай губерні паведамляў: «…Вся тяжесть его [надзора за частными и защитными лесами] ложится на местных лесничих, обремененных настолько прямыми служебными обязанностями, что предъявляемые к ним требования оказываются совершенно непосильными…». З мэтай выпраўлення становішча было прапанавана павялічыць колькасць малодшых запасных ляснічых для выканання распараджэнняў камітэта і заснаваць конную лясную варту для нагляду за прыватнаўласніцкімі і ахоўнымі лясамі. Аналізуючы колькасць лясоў, на якія распаўсюджвалася дзеянне «Положения о сбережении лесов», і мясцовых лясных чыноўнікаў, можна меркаваць, што адзначаная праблема ў той ці іншай ступені была характэрна і для астатніх беларускіх губерняў [16, 141–143 адв.].

*Заключэнне.* Такім чынам, дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання па распрацоўцы і рэалізацыі «Положения о сбережении лесов» была дастаткова паспяховай на тэрыторыі беларускіх губерняў. Захады ўрада ў адзначаным кірунку дазволілі распаўсюдзіць дзейнасць дзяржаўнай лясной адміністрацыі на мясцовыя лясы, незалежна ад іх маёмаснай прыналежнасці, што, у сваю чаргу, стварала спрыяльныя ўмовы для эфектыўнай рэалізацыі аховы і зберажэння лясных багаццяў края.

*Літаратура і крыніцы*

1. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). – Ф. 387. Воп. 21. Спр. 73437.
2. РДГА. – Ф. 387. Воп. 28. Спр. 1222.
3. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – 3 е собр. – Т. 8. – Отд. 1. – № 5120. – С. 148–156.
4. РДГА. – Ф. 387. Воп. 4. Спр. 30790.
5. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 12. – Отд. 1. – № 8560. – С. 318.
6. РДГА. – Ф. 387. Воп. 6. Спр. 35461.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску. – Ф. 27. Воп. 2. Спр. 1679.
8. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 8. – Отд. 1. – № 5669. – С. 634, 635.
9. Приложение к отчету по лесному управлению за 1901 год // Отчет по лесному управлению Министерства земледелия и государственных имуществ за 1901 год. Составлен IX отделением Лесного департамента. – СПб. : Типолитография Ю. Я. Римана, 1902. – 273 с.

*References*

1. Rasijski dzyarzhaǔny gistarychny arhiǔ (dalej – RDGA). – F. 387. Vop. 21. Spr. 73437.
2. RDGA. – F. 387. Vop. 28. Spr. 1222.
3. Polnoe sobranie zakonov Rossijskoj imperii (dalej – PSZRI). – 3 e sobr. – T. 8. – Otd. 1. – № 5120. – S. 148–156.
4. RDGA. – F. 387. Vop. 4. Spr. 30790.
5. PSZRI. – 3-e sobr. – T. 12. – Otd. 1. – № 8560. – S. 318.
6. RDGA. – F. 387. Vop. 6. Spr. 35461.
7. Nacyyanal'ny gistarychny arhiǔ Belarusi ǔ g. Minsku. – F. 27. Vop. 2. Spr. 1679.
8. PSZRI. – 3-e sobr. – T. 8. – Otd. 1. – № 5669. – S. 634, 635.
9. Prilozhenie k otchetu po lesnomu upravleniyu za 1901 god // Otchet po lesnomu upravleniyu Ministerstva zemledeliya i gosudarstvennyh imushchestv za 1901 god. Sostavlen IX otdeleniem Lesnogo departamenta. – SPb. : Tipolitografiya Yu. Ya. Rimana, 1902. – 273 s.

10. Приложение 2-е к отчету по лесному управлению за 1902 год. Ведомости // Отчет по лесному управлению Министерства земледелия и государственных имуществ за 1902 год. Составлен IX отделением Лесного департамента. – СПб. : Типолитография Ю. Я. Римана, 1903. – 313 с.
11. Приложение к отчету по лесному управлению за 1903 год // Отчет по лесному управлению за 1903 год. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб. : Типолитография Ю. Я. Римана, 1904. – 293 с.
12. Приложение к отчету по лесному управлению за 1904 год // Отчет по лесному управлению за 1904 год. – СПб. : Типолитография Ю. Я. Римана, 1906. – 363 с.
13. Приложение к отчету по лесному управлению за 1905 год // Отчет по лесному управлению за 1905 год. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб. : Типография под фирмой «Г. П. Пожаров», 1907. – 497 с.
14. Приложение к отчету по лесному управлению за 1906 год // Отчет по лесному управлению за 1906 год. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб. : Типолитография Ю. Я. Римана, 1908. – 461 с.
15. Приложение к отчету по лесному управлению за 1907 год // Отчет по лесному управлению за 1907 год. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб. : Типолитография Ю. Я. Римана, 1909. – 489 с.
16. РДГА. – Ф. 387. Воп. 6. Спр. 35432.

10. Prilozhenie 2-e k otchetu po lesnomu upravleniyu za 1902 god. Vedomosti // Otchet po lesnomu upravleniyu Ministerstva zemledeliya i gosudarstvennyh imushchestv za 1902 god. Sostavlen IX otdeleniem Lesnogo departamenta. – SPb. : Tipolitografiya Yu. Ya. Rimana, 1903. – 313 s.
11. Prilozhenie k otchetu po lesnomu upravleniyu za 1903 god // Otchet po lesnomu upravleniyu za 1903 god. Sostavlen V otdeleniem Lesnogo departamenta. – SPb. : Tipolitografiya Yu. Ya. Rimana, 1904. – 293 s.
12. Prilozhenie k otchetu po lesnomu upravleniyu za 1904 god // Otchet po lesnomu upravleniyu za 1904 god. – SPb. : Tipolitografiya Yu. Ya. Rimana, 1906. – 363 s.
13. Prilozhenie k otchetu po lesnomu upravleniyu za 1905 god // Otchet po lesnomu upravleniyu za 1905 god. Sostavlen V otdeleniem Lesnogo departamenta. – SPb. : Tipografiya pod firmoj «G. P. Pozharov», 1907. – 497 s.
14. Prilozhenie k otchetu po lesnomu upravleniyu za 1906 god // Otchet po lesnomu upravleniyu za 1906 god. Sostavlen V otdeleniem Lesnogo departamenta. – SPb. : Tipolitografiya Yu. Ya. Rimana, 1908. – 461 s.
15. Prilozhenie k otchetu po lesnomu upravleniyu za 1907 god // Otchet po lesnomu upravleniyu za 1907 god. Sostavlen V otdeleniem Lesnogo departamenta. – SPb. : Tipolitografiya Yu. Ya. Rimana, 1909. – 489 s.
16. RDGA. – F. 387. Vop. 6. Spr. 35432.